21 сакавіка ў аддзеле краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі адбылася творчая сустрэча са знакамітымі літаратарамі Віцебшчыны “Неўміручая песня паэзіі”, прымеркаваная да Міжнароднага дня паэзіі.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 27 марта. – С. 1.

22 сакавіка ў Віцебскім абласным інстытуце развіцця адукацыі для школьных бібліятэкараў Віцебскай вобласці супрацоўнікамі аддзела перыядычнай літаратуры і агульнай чытальнай залы была праведзена мультымедыйная прэзентацыя «Перыядычныя выданні, якія паступілі ў ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”», а таксама агляд новых паступленняў “Праваслаўная энцыклапедыя”.

27-28 сакавіка ў бібліятэцы прайшоў двухдзённы абласны семінар “Публічныя бібліятэкі ў сацыякультурным асяроддзі рэгіёна” для дырэктароў цэнтральных раённых і гарадскіх сетак публічных бібліятэк.

10 красавіка ў межах агульнабібліятэчных мерапрыемстваў, прысвечаных Году кнігі, супрацоўнікі аддзелаў перыядычнай літаратуры і абанемента правялі інфармацыйны агляд навінак сучаснага друку для спецыялістаў Віцебскага абласнога суда.

16 красавіка супрацоўнікамі нямецкай чытальнай залы

сумесна з прадстаўнікамі Інстытута імя Гётэ ў г. Мінску была падрыхтавана і праведзена сустрэча з доктарам *Дзіркам Вісэнам*, дырэктарам Гарадской і рэгіянальнай бібліятэкі г. Франкфурта-на-Одэры. У мерапрыемстве прынялі ўдзел загадчыкі аддзелаў абласной бібліятэкі, калегі з гарадской сеткі бібліятэк, а таксама Наваполацкай, Полацкай і Аршанскай ГЦБС.

17 красавіка ў Дзяржаўнай установе дадатковай адукацыі "Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі" для сацыяльных педагогаў супрацоўнікамі чытальнай залы была праведзена выстава-агляд літаратуры па тэме "Сям'я ў сучасным свеце", прысвечаная Міжнароднаму дню сям'і.

19 красавіка ў выставачнай галерэі абласной бібліятэкі адбылося адкрыццё выставы жывапісу "Стыхія колеру" заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь *Аляксандра Салаўёва.*

26 красавіка ва УУС Віцебскага аблвыканкама прайшло ўшанаванне ўдзельнікаў ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У рамках гэтага мерапрыемства супрацоўнікамі аддзела агульнай чытальнай залы была падрыхтавана выстава-прагляд "Чарнобыль і Беларусь: мінулае, сучаснасць, будучыня", на якой былі прадстаўлены кнігі, перыядычныя выданні, фотаальбомы і бібліяграфічныя выданні.

Аддзел літаратуры па мастацтве сумесна з Віцебскім абласным краязнаўчым музеем, музеем "Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва", а таксама віцебскім аддзяленнем Беларускага саюза мастакоў рэалізаваў праект, прысвечаны творчасці беларускага мастацтвазнаўца, мастака і краязнаўца *Генадзя Пятровіча Лебедзева*. Вынікам супрацоўніцтва стаў каталог выставы "Генадзь Лебедзеў. Зачараваны даўніной", якая экспанавалася ў кастрычніку 2011 года ў Мастацкім музеі г. Віцебска і была прысвечана памяці мастака.

Аляксандрам Сідаравым, лялькі і касцюмы – *Ганнай Сідаравай*. Спектакль музычны (кампазітар *Алег Залётнеў*), з песнямі і танцамі (харэаграфія *Дзіяны Юрчанка*). У пастаноўцы задзейнічалі як маладых артыстаў (*Сяргея Талкача, Валерыя Зімніцкага, Міхаіла Клімчука, Марыну Марозаву і Яўгена Гусева*), так і артыстаў, ужо добра вядомых віцебскаму гледачу па іншых спектаклях (*Вольгу Маханькову, Аляксея Макарскага, Вольгу Лазебную, Наталлю Гайдук*). З нагоды свята перад спектаклем адбыўся святочны канцэрт. Акцёры са здавальненнем прымалі віншаванні і дзяліліся добрым настроем з гледачамі.

Вядучыя майстры сцэны Беларускага тэатра "Лялька" *Юрый Франкоў і Аляксандр Маханькоў* узнагароджаны нагруднымі знакамі Міністэрства культуры РБ «За ўклад у развіццё культуры Беларусі". Абодва артысты плённа працуюць на сцэне тэатра больш за 25 гадоў, за гэты час яны неаднойчы адзначаліся крытыкамі як таленавітыя і яркія акцёры, імі створана мноства выдатных вобразаў на сцэне, а на сённяшні час яны занятыя ў большасці рэпертуарных спектакляў тэатра.

Беларускі тэатр "Лялька"
Народнае слова. – 2012. – 21 сак. – С. 3.
Народнае слова. – 2012. – 31 сак. – С. 5.
Витебский проспект. – 2012. – 26 апр. – С. 22.

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь адкрыў свой філіял у Наваполацку. Трохбаковы дагавор, заключаны паміж тэатрам, Наваполацкім гарадскім выканкамам і ААТ "Нафтан", прадугледжвае супрацоўніцтва ў сферы арганізацыі гастрольных выступленняў як асобных артыстаў, так і паказаў оперных і балетных спектакляў.

У Нафтаградзе адкрываецца другая выязная сцэна вядомай беларускай трупы. Першы філіял Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі быў створаны ў студзені 2011 года ў Магілёве.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 17 сак. – С. 6.

З **23 сакавіка** па **11 мая** канцэртная зала Сафійскага сабора запрашае на XXV Міжнародны фестываль старажытнай і сучаснай камернай музыкі.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 22 сак. – С. 22.

КІНАВІДЭАМАСТАЦТВА

З **5** па **7 красавіка** ў віцебскім кінатэатры "Мир" прайшла дэманстрацыя фільмаў – пераможцаў Манхэтанскіх фестываляў апошніх трох гадоў. Наш абласны цэнтр у мінулым годзе ўпершыню быў уключаны ў склад гарадоў свету, у якіх кінагледачы вызначаюць лаўрэатаў фестывалю.

Народнае слова. – 2012. – 3 крас. – С. 8.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 3 сак. – С. 8.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа *Святлана Жукоўская* атрымала прыз Беларускага саюза тэатральных дзеячаў "Крыштальная зорка".

Народнае слова. – 2012. – 31 сак. – С. 5.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 3 апр. – С. 2.

21 сакавіка Беларускі тэатр "Лялька" адзначыў сусветны Дзень лялечніка. Да гэтай даты была прымеркавана здача прэм'ернага спектакля "Ямелева шчасце", некалі вельмі папулярнага на сцэне тэатра. Гэта пастаноўка на працягу двух дзесяцігоддзяў ішла пад назвай "Казка пра Ямелю". Сёлета спектакль атрымаў другое жыццё, з новым складам акцёраў, новымі дэкарацыямі, лялькамі і касцюмамі. Яркую і маляўнічую пастаноўку ажыццявіў мастацкі кіраўнік тэатра заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь *Віктар Клімчук*. Сцэнаграфія зроблена

Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк

Вынікі літаратурнай дзейнасці за мінулы год, а таксама планы на бягучы абмяркоўвалі ў **сакавіку** члены СП Беларусі ў цэнтральнай бібліятэцы імя М. Горкага разам з партнёрамі – бібліятэкарамі і прадстаўнікамі абласнога аддзялення Фонду міру.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 17 марта. – С. 5-7.

Народнае слова. – 2012. – 13 сак. – С. 8.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 20 сак. – С. 6.

Дзіцячая бібліятэка імя Я. Маўра атрымала больш за 500 тысяч кніг з асабістага збору ветэрана Вялікай Айчыннай вайны *Льва Міхайлавіча Салаўёва,* які доўгі час з'яўляўся чытачом бібліятэкі.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 10 апр. – С. 2.

Цікавую выставу дзіцячай творчасці "У гасцях у казкі" прадставілі ў бібліятэцы імя М. Горкага дзевятнадцать дзіцячых калектываў устаноў дадатковай адукацыі і школ.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 17 апр. – С. 6.

Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

У цэнтральнай бібліятэцы імя У. Маякоўскага **1 сакавіка** адбылася персанальная выстава мастацкіх работ *Марыны Кражавай* "Я рисую свой мир как хочу". Яе пейзажы, казачныя сюжэты, цыкл графічных работ, прысвечаныя мюзіклу "Моцарт", выклікалі вялікую цікавасць у прыхільнікаў мастацтва сваёй глыбіней, філасофскай мудрасцю, вытанчанасцю выканання.

16 сакавіка ў бібліятэцы імя К. Сіманава прайшла бібліятэчная шоу-праграма для маладых людзей з асаблівасцямі развіцця "Я б в читатели пошел. Пусть меня научат". Мерапрыемства было прысвечана Году кнігі. У госці былі запрошаны хлопчыкі і дзяўчынкі Наваполацкага Цэнтра карэкцыйна-

развіваючага навучання і рэабілітацыі, а таксама грамадская арганізацыя "Асацыяцыя бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю «Струмок» з горада Полацка. Сцэнарый мерапрыемства быў распрацаваны з улікам магчымасцяў маладых людзей, падабраны конкурсы, гульні, віктарыны. Шоу-праграма пачыналася са свята пасвячэння ў чытачы, удзельнікі далі «Клятву чытача», ім былі ўручаны памятныя чытацкія фармуляры (да кожнага фармуляра была зроблена фатаграфія ўдзельніка). У камандных спаборніцтвах новыя чытачы паказалі веды аб літаратурных героях, аўтарах твораў, прымалі ўдзел у гульні "Што бывае ў бібліятэцы", вызначалі чытацкае прызначэнне кніг і часопісаў.

6 сакавіка для выхаванцаў дзіцячага дома дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна арганізавала сустрэчу з маёрам *Я. Русаковым*, які вельмі цікава распавёў пра работу Наваполацкага аддзела Дэпартамента аховы Рэспублікі Беларусь. Асаблівае ўражанне на дзяцей аказала магчымасць разбору-збору зброі, было шмат пытанняў, пасля чаго дзеці расказалі вершы і павіншавалі госця сустрэчы з прафесійным святам – Днём беларускай міліцыі.

Полацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

20 сакавіка ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога адбылося свята "Чукокола – весёлая страна!», якое адкрыла Тыдзень дзяцячай кнігі ў Полацкай ЦБС. На свяце прысутнічалі вучні 2-х класаў СШ № 10, якія пазнаёміліся з жыццём выдатнага дзіцячага пісьменніка К. І. Чукоўскага. Дзеці разгадвалі красворды, удзельнічалі ў мультывіктарыне па казках і ў розных гульнях, адгадвалі загадкі і нават сталі акцёрамі ў тэатралізаваным экспромце "Муха-Цокотуха".

21 сакавіка ў межах праграмы "Невядомыя імёны

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 27 марта. – С. 2.

16 красавіка ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кола горада Віцебска "Дзвіна"» адкрылася традыцыйная выстава-конкурс "Божий мир глазами детей". На выставе прадстаўлена больш за 500 твораў, выкананых ў розных тэхніках: кераміка, вышыўка, выцінанка, малюнкі і інш.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 21 крас. – С. 8.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

9 сакавіка ў канцэртнай зале "Віцебск" прайшоў юбілейны творчы вечар вядомага ў нашым горадзе майстра вакальных спеваў, хормайстра, старшыні цыклавай камісіі "Дырыжыраванне" Віцебскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя І. І. Салярцінскага, мастацкага кіраўніка вакальнага ансамбля "Резонанс" Цэнтра культуры "Віцебск" *Аляксандра Міхайлавіча Суворава*.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 9 марта. – С. IV.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 20 сак. – С. 6.

"Сын земли витебской – композитор Анатолий Васильевич Богатырев" – вялікі канцэрт з такой назвай адбыўся **22 сакавіка** ў школе мастацтваў г. Віцебска, якая з нядаўняга часу носіць імя вядомага земляка.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 27 марта. – С. 2.

"Музыкальная капель" – так называецца фестываль фартэпіянная музыкі, які ўжо ў трэці раз прайшоў у Барані. У ім прынялі ўдзел больш за 500 маладых талентаў з Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей.

Народнае слова. – 2012. – 3 крас. – С. 8.

75 гадоў споўнілася дзіцячай школе мастацтваў № 1 г. Оршы. Адна са старэйшых у рэспубліцы ўстаноў культуры была створана ў 1937 годзе, а яго гісторыю актыўна стваралі як педагогі, так і вучні.

Витебский проспект. – 2012. – 19 апр. – С. 23.

Выстава з фондаў міжнароднага конкурсу жывапісу і графікі “На своей земле” упершыню экспануецца ў Віцебску, у дзіцячай мастацкай школе № 1.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 28 апр. – С. 16.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

Новы мастацкі салон адкрыўся ў Наваполацкім Цэнтры рамёстваў.

Народнае слова. – 2012. – 6 сак. – С. 8.

З **сакавіка** па **ліпень** абласны метадычны цэнтр народнай творчасці праводзіць акцыю нацыянальных культур “Часцінку сэрца дару Беларусі”. Мэта мерапрыемства – пазнаёміць насельніцтва з самабытнай і шматграннай творчасцю прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, што пражываюць на Віцебшчыне.

Віцебскі АМЦНТ

Народнае слова. – 2012. – 14 крас. – С. 7.

Разнастайныя экспанаты прадстаўлены на справаздачнай выставе народнай творчасці “Народныя ўзоры”, якая праходзіць у Докшыцкім раённым Доме рамёстваў. Прадстаўлены работы майстроў мастацкай разьбы па дрэве, саломапляценні, вышыўцы і ткацтве, керамікі членаў клуба народных майстроў “Докша”.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 17 марта. – С. III.

“Предчувствие весны” – так назвалі выставу, якая адкрылася ў культурна-гістарычным комплексе «Залатое кола горада Віцебска “Дзвіна”», удзельніцы народнага клуба аматараў фларыстыкі “Анюта”.

Народнае слова. – 2012. – 6 сак. – С. 5.

Справаздачная выстава народнага клуба майстроў “Крыніца” і Глыбоцкага Дома рамёстваў “Рамёстваў Глыбоцкіх сузор’е” прайшла ў **сакавіку** ў выставачнай зале гарадскога цэнтра культуры.

Полаччыны” адбылася сустрэча «Человек читающий - человек успешный» з карэспандэнтам газеты “Полацкі веснік” *Аксанай Шуйскай*. На мерапрыемстве прысутнічалі вучні СШ № 6 і СШ № 8. На сустрэчы былі прадстаўлены фотаздымкі калетыва рэдакцыі газеты, артыкулы прысутнага карэспандэнта, старыя нумары газеты. Музычнае суправаджэнне струннага ансамбля «Пиццикато» ўнесла лірычную ноту ў мерапрыемства.

27 сакавіка ў літаратурна-музычнай гасцёўні «Под сенью духовности» бібліятэкі імя Я. Купалы адбылася гадзіна духоўнай асветы «Святость Полоцкой земли», якая была прысвечана Дню праваслаўнай кнігі і 1020-годдзю Полацкай епархіі. Мерапрыемства было падрыхтавана сумесна з сёстрамі Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Госць мерапрыемства – святар *Ігар Лысенок* – паведаміў аб жыцці святога пакутніка Канстанціна. Падрабязна і яскрава жыццё Опцінскага старца Варсанофія апісала паслушніца *Алена (Мастыко)*. Паслушніца *Вольга Быхаўцова* правяла экскурсію па фотавыставе “Фрески Полоцкого Спасского храма». На мерапрыемстве прысутнічалі жыхары мікрараёна Марыненкі, педагогі Полацка і Наваполацка.

10–11 красавіка на базе Полацкай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Ф. Скарыны прайшоў двухдзённы абласны семінар “Статус і развіццё публічных цэнтраў правовой інфармацыі ў сучасных умовах інфарматызацыі грамадства”, удзельнікамі якога сталі кіраўнікі і супрацоўнікі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Віцебскай абласной бібліятэкі і супрацоўнікі ПЦПІ цэнтральных раённых і гарадскіх бібліятэк.

Віцебская раённая сетка публічных бібліятэк

6 сакавіка цэнтральная раённая бібліятэка запрасіла бібліятэчных работнікаў і ветэранаў бібліятэчнай справы на

чарговае пасяджэнне клуба “Ветэран” “О, женщина, краса земная”, прысвечанае Дню жанчын. Незабыўныя хвіліны сустрэчы падарыла прысутным вядомая паэтка, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшыня Віцебскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі *Т. І. Краснова-Гусачэнка.* Цікавымі былі яе развагі наконт сучаснага стану грамадства, яго духоўных вытокаў.

15 сакавіка для малодшых школьнікаў гімназіі № 6 цэнтральная бібліятэка падрыхтавала ўрок этыкі “Спяшайцеся рабіць дабро”. Адказы на пытанні дабра і зла дзеці шукалі ў творах А. Барто, Н. Тулупавай, В. Асеевай.

21 сакавіка адбылося чарговае пасяджэнне ўдзельнікаў дзіцячага і юнацкага клуба “Возьмемся за рукі, сябры” ў Ноўкінскай сельскай бібліятэцы. Яно было прысвечана Дню культуры каралеўства Тайланд. У праграме Дня: кніжная выстава і віртуальнае падарожжа “Тайланд – краіна тысячы ўсмешак”.

23 сакавіка цэнтральная бібліятэка правяла для дзяцей гульню-падарожжа “Гэты цудоўны свет – Прырода”. Пасяджэнне дзіцячага экалагічнага клуба “Одуванчик” праходзіла ў форме энтамалагічнай гульні-прэзентацыі “Насякомыя: знаёмыя і незнаемыя”.

27 сакавіка Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі ў Бабініцкай бібліятэцы адкрыўся тэатралізаваным прадстаўленнем “Кніга – мой спадарожнік і сябра”. У рамках Тыдня прайшлі наступныя мерапрыемствы: урок ведаў з мультымедыйным суправаджэннем “Адкуль да нас прыйшла кніга”, конкурс малюнкаў і творчых работ дзяцей “Кніг любімыя старонкі”, конкурс юных чытальнікаў і аматараў беларускай паэзіі “Звіні, спявай купалаўская ліра”.

Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк

У **сакавіку** ва ўсіх бібліятэках ЦБС прайшоў Тыдзень

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

2 сакавіка ў Мастацкім музеі Віцебска адкрылася выстава “Художник и цветы” ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, прафесара ВДУ імя П. М. Машэрава *Анатоля Фёдаравіча Кавалёва.*

Віцебскі рабочы. – 2012. – 6 сак. – С. 8.

Витебский проспект. – 2012. – 8 марта. – С. 23.

Абласны краязнаўчы музей напярэдадні Дня жанчын прадставіў выставу работ *Ліліі Васільеўны Каваленка* “Цветы весны”.

Витебский проспект. – 2012. – 15 март .– С. 23.

Выстава работ віцебскага мастака *Аляксандра Дасужава* “Акватайм” адкрылася ў пачатку **сакавіка** ў мастацкім салоне-галерэі “Стена”.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 15 сак. – С. 15.

Завершаны работы па аднаўленні карцін *Юрыя Пэна* з фонду Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. 160 палотнаў, амаль ўсю калекцыю жывапісу Пэна, рэстаўратар вышэйшай катэгорыі *Юрый Кегелеў* вярнуў да жыцця.

Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 15 марта. – С. IV.

Выстава батыку *Алены Карпіцкай* “Иллюстрация” прадстаўлена ў Мастацкім музеі.

Витебский проспект. – 2012. – 22 марта. – С. 23.

Цэнтр сучаснага мастацтва прадстаўляе праект “Allegretto”, тэма якога - карнавал. Гэта чарговы праект творчага аб’яднання “M’art”, які прайшоў ужо ў сёмы раз і аб’яднаў жывапіс, графіку, скульптуру, фотамастацтва.

Витебский проспект. – 2012. – 29 марта. – С. 23.

Віцебскі мастак *Аляксандр Фёдаравіч Карпан* прадстаўляе экспазіцыю нацюрмортаў і пейзажаў у салоне-галерэі “Стена”.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 10 крас. – С. 8.

Выставачны праект новых арт-аб’ектаў “Своя игра” (The Game) прадстаўляе віцебская мастачка *Ніна Кавалёва* ў Мастацкім музеі.

галоўнай кнігай хрысціянства – Бібліяй, некаторымі творамі мастацкай літаратуры, якія дапамагаюць чалавеку зразумець сэнс жыцця і задумацца пра некаторыя свае ўчынкі.

23 сакавіка адбылося адкрыццё Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ў дзіцячай бібліятэцы. На працягу тыдня юныя чытачы ўдзельнічалі ў літаратурных конкурсах, віктарынах, разам з Бабай Ягой падарожнічалі па краіне Літаратурыі, разгадвалі загадкі, рашалі складаныя задачы.

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА

Выстава кніг з прыватнага збору адкрылася ў Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова. На ёй прадстаўлена каля 30 кніг і 90 паштовак з калекцыі старшага навуковага супрацоўніка музея *Дзяніса Якаўлева*, і прысвечана яна 200-годдзю Айчыннай вайны 1812 года.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 3 сак. – С. 6.

“1812 год ў артэфактах” – выстава з такой назвай адкрылася ў Мастацкім музеі Віцебска. На ёй прадстаўлены ўнікальныя прадметы – сведчанне гістарычных падзей вайны з Напалеонам. Аўтары экспазіцыі – калекцыянеры *Аляксандр Мачульскі* з Віцебска і *Аляксандр Рэянтовіч* з Барысава.

Народнае слова. – 2012. – 17 крас. – С. 8.

МАСТАЦТВА

АРХІТЭКТУРА

Пачалася рэканструкцыя палаца Тызенгаўза ў Паставах. Разам з калегамі з літоўскага Рокішкіса пастаўчане выйгралі тэндэр на адпаведны грант Еўрасаюза.

Народнае слова. – 2012. – 17 крас. – С. 5.

дзіцячай і юнацкай кнігі.

З **12 сакавіка** па **1 красавіка** ў цэнтральнай бібліятэцы праходзіў тыдзень прафарыентацыі для падлеткаў.

22 сакавіка ў рамках пасяджэння клуба “Юныя сябры прыроды” адбылося экалагічнае падарожжа па часопісе “Родная прырода”, а таксама падрыхтавана кніжна-ілюстраваная выстава “В гармонии с природой”.

26 сакавіка ў дзіцячай бібліятэцы прайшла тэатралізавана-гульнёвая праграма “Лепшы знаўца коласаўскіх казак”

27 сакавіка ў Гірэйшанскай сельскай бібліятэцы ў рамках пасяджэння Школы беларускага чытання быў праведзены конкурс на лепшага чытальніка вершаў “Вершаў любімых радкі”.

Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк

20 сакавіка Гарадоцкая дзіцячая бібліятэка запрасіла дзяцей на адкрыццё Тыдня дзіцячай кнігі, якое было арганізавана бібліятэкай у Доме культуры. Мерапрыемства пад назвай “Книжное царство – мудрое государство” прайшло сумесна з сярэдняй школай № 1 і Цэнтрам дзяцей і моладзі. Да мерапрыемства была афармлена кніжная выстава “Пусть всегда будет книга”, супрацоўнікі расказалі аб сваёй бібліятэцы, расказ суправаджаўся прэзентацыяй. Напрыканцы мерапрыемства бібліятэкары павіншавалі лепшых чытачоў і ўручылі ім памятныя падарункі.

15 сакавіка ў Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэцы на чарговым пасяджэнні “Клуба интересных встреч” прайшла прэзентацыя кнігі М. В. Півавара “Краязнаўцы Віцебшчыны канца XX – пачатку XI ст.”.

30 сакавіка на базе Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэкі прайшоў дзень прафесійных ведаў для работнікаў сельскіх бібліятэк “Месца і роля кнігі ў бібліятэчным абслугоўванні дзяцей і падлеткаў

на сучасным этапе”. На мерапрыемстве выступілі бібліятэкар Гарадоцкай дзіцячай бібліятэкі *Т. Ф. Нікалаева* і метадыст аддзела маркетынгу *Г. І. Тутава*. Яны далі метадычныя парады бібліятэкарам, а метадыст *К. А. Банадысева* правяла літаратурную інтэлектуальную віктарыну “Ці ведаеце Вы творы дзіцячых пісьменнікаў?”

Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк

5 сакавіка ў бібліятэцы-цэнтры экалагічнай асветы аграгарадка Асінторф прайшло свята кнігі “Все началось с таблички, свитка, бересты…”.

21 сакавіка ў раённым Доме культуры адбыўся вечар па творчасці самадзейнай паэткі *Ірыны Малчанавай* “Я душу выплесну в стихах”, прысвечаны Сусветнаму дню паэзіі.

23 сакавіка дзіцячая бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў на мерапрыемства, прымеркаванае да 130-годдзя з дня нараджэння К. Чукоўскага “Добрыя кнігі добрага чалавека”.

У **сакавіку** ў сельскай бібліятэцы аграгарадка Дабрынь прайшло літаратурнае свята “Великан по имени Чукоша”.

Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк

У рамках Года кнігі ў раённай бібліятэцы прайшла выстава-агляд творчасці пісьменнікаў-юбіляраў “Писателем нужно родиться: зарубежная литература” і інфармацыйная гадзіна «Прапануем пазнаёміцца: *Алена Мінчукова* “Венок судьбы”» (бібліёбус).

Да Дня барацьбы з наркаманіяй і наркабізнесам у сельскіх бібліятэках раёна прайшла гутарка-абмеркаванне “Наркотики – понимать и противостоять”.

13 сакавіка ў інфармацыйным цэнтры раённай бібліятэкі “Скарбніца здароўя” адбылася кансультацыя правізара

Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк

Году кнігі была прысвечана сустрэча ў цэнтральнай раённай бібліятэцы “Тут словы прарастаюць, як трава” з удзельнікамі паэтычнага аб’яднання “Млын”, якое працуе пры Новалукомльскай гарадской бібліятэцы. Для чашнічан гучалі вершы і песні мясцовых паэтаў, адбылася прэзентацыя другога зборніка вершаў “Вслед за мечтой”.

Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі ў Чашніцкай гарадской бібліятэцы пачаўся з забаўляльнай праграмы “В гостях у дедушки Корнея”, якая запрасіла прысутных у чароўную казачную краіну, дзе жывуць добрыя казкі К. І. Чукоўскага. Хлопчыкі і дзяўчынкі ўдзельнічалі ў розных конкурсах, дзе трэба было пазнаць казку па ўрыўку, закончыць чатырохрадкоўе, знайсці рэчы з казак. Гульня па творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа “Нам засталася спадчына…” ўзнавіла звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, цікавасць да іх творчасці. Конкурс знаўцаў “З кнігай – праз вякі” пачаўся з загадкі і экскурса ў гісторыю кнігі. Далей бібліятэкар засяродзіла ўвагу на арганізаванай выставе пад назвай “Хочаш вершы, хочаш казкі, выбірай жа, калі ласка!”. Конкурс “рэдактараў” патрабаваў сачыць за лагічнасцю думкі і паслядоўнасці падзей: трэба было прыгадаць любімыя казкі і аднавіць іх па апорных словах; прапанаваў зрабіць рэкламу кнігі з дапамогай слоганаў і тэкстаў конкурс капірайтараў.

Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк

6 сакавіка ў раённай бібліятэцы адбылася прэзентацыя творчых работ удзельніц клуба “Жаночы час”.

14 сакавіка з нагоды Дня Праваслаўнай кнігі бібліятэкар Пашкоўскай бібліятэкі завітала ў госці да вучняў Шкунцікаўскай школы і правяла ўрок духоўнасці “І лік святы нам душу грэе”. У рамках мерапрыемства хлопчыкі і дзяўчынкі пазнаёміліся з

кветкаводаў “Кветкавы кірмаш”, якая была арганізавана бібліятэкай сумесна з кіраўніком народнай жаночай суполкі. У рамках гэтай акцыі было праведзена некалькі мерапрыемстваў: кніжная выстава “Усё аб кветках”, тэматычны вечар “Хатнія кветкі”, віктарына “Экалогія і фітадызайн”, аўкцыён кветак.

Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк

Работа па прапагандзе лепшых твораў літаратуры традыцыйна вялася бібліятэкамі сістэмы ў час Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ”Книжная Вселенная”.

Сенненская раённая дзіцячая бібліятэка з лялечнымі спектаклямі выступала перад школьнікамі раёна.

Вучні гарпасёлка Багушэўск былі запрошаны на літаратурнае свята “С тобою, книга добрая моя”.

Конкурс знаўцаў літаратуры “Милее книги друга нет” адбыўся ў Рулёўшчынскай бібліятэцы.

На відэаўроку ”Гномик-экономик” у Машканскай бібліятэцы маленькія чытачы вучыліся азам беражлівасці.

Бібліятэкар Ходцаўскай бібліятэкі падрыхтавала тэатралізаванае падарожжа “Любімы казачны герой”.

Ва ўсіх бібліятэках сістэмы праведзены віктарыны, літаратурныя гадзіны, паэтычныя вечары, выставы-прагляды навінак літаратуры. Да Дня жанчын ў бібліятэках прайшлі літаратурна-музычныя кампазіцыі, конкурсна-займальныя праграмы, агеньчыкі, святы.

Гадзіны ідэалогіі і права “Асноўны Закон маёй дзяржавы” прысвячаліся Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Прапагандзе здаровага ладу жыцця і прававому выхаванню садзейнічалі акцыі “Не сломай свою судьбу” (антынаркатычная), “Тваё жыццё – твой выбар”(антыалкагольная), “Сябруем з законам”.

цэнтральнай аптэкі “Дзяўчыне – асобая ўвага”.

26 сакавіка прайшоў кіналекторый для людзей з абмежаванымі магчымасцямі “Синема – открытое окно”.

Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк

З **12** па **16 сакавіка** ў дзіцячай бібліятэцы адбыўся Тыдзень гісторыі. Былі афармлены дзве кніжныя выставы: “Истории дыхание живое” і “Недаром помнит вся Россия…”.Праведзены наступныя мерапрыемствы: кнігападарожжа “Бородинская битва”, гадзіна гісторыі “Война 1812 года”, віктарына “Поля ратной славы”, прагляд фрагменту кінастужкі “Эскадрон гусар летучих”.

28 сакавіка самадзейныя паэты раёна прынялі ўдзел у паэтычным конкурсе “Да будет слово явлено…”, які быў арганізаваны літаратурным аб’яднаннем “Современник” і раённай бібліятэкай г. Рудні Смаленскай вобласці. Конкурс праводзіўся сярод удзельнікаў літаратурных аб’яднанняў Руднянскага, Веліжскага, Дзямідаўскага раёнаў Смаленскай вобласці і Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці ў рамках паэтычнага свята, прысвечанага Сусветнаму дню паэзіі.

30 сакавіка раённай бібліятэкай была падрыхтавана літаратурна-музычная вечарына “Струменіць паэтычны ручаёк…”, прысвечаная творчасці нашай зямлячкі, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі *Надзеі Салодкай*. На разгорнутай кніжнай выставе "Няхай не высахне выток…” былі прадстаўлены кнігі, перыядычныя выданні, асобныя артыкулы, фатаграфіі. Вядучыя вечарыны пазнаёмілі з біяграфіяй *Н. Салодкай*, расказалі аб яе творчасці і прачыталі вершы. Сустрэча суправаджалася паказам электроннай прэзентацыі фотаздымкаў з асабістага архіва *Н. Салодкай*, што дазволіла слухачам больш поўна пазнаёміцца з жыццём і творчасцю паэткі. На мерапрыемстве прысутнічалі сваякі і знаёмыя

Н. Салодкай, якія падзяліліся асабістымі ўражаннямі і прачыталі вершы. Прагучалі на вечары і песні на словы паэтэсы ў выкананні мясцовых артыстаў.

Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк

14 сакавіка ў Міёрскай цэнтральнай бібліятэцы адбыўся вечар-дыялог “Праваслаўная кніга ў сучасным свеце”, які сабраў аўдыторыю людзей розных прафесій. *Айцец Віктар* расказаў пра значэнне і ўнікальнасць духоўнай літаратуры. З цікавасцю знаёміліся ўдзельнікі сустрэчы з выставай “Для душы карыснае слова”.

Падобнае мерапрыемства прайшло ў Міёрскай дзіцячай бібліятэцы пад назвай “Вера - сэнс жыцця”. Разглядаліся розныя пытанні: чым праваслаўная кніга адрозніваецца ад іншых, як чытаць святое Пісанне, уплыў кнігі на светапогляд чалавека.

З **25** па **29 сакавіка** бібліятэкі раёна адзначалі Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі. Асноўныя мерапрыемствы прайшлі ў Міёрскай і Дзісненскай дзіцячых бібліятэках. Сярод іх - сустрэча маладых паэтаў ”Путаница дедушки Корнея”, сустрэча-дыялог “Дар дабра і міласэрнасці”, гадзіна беларускай культуры “Хата з матчынай душой” і інш.

Бібліятэчнае падарожжа “Грунвальская бітва” прайшло ў Язненскай бібліятэцы. Бібліятэкар зрабіла агляд літаратуры, расказала пра аўтараў, якія пісалі апавяданні, паэмы і вершы пра той перыяд.

Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк

7 сакавіка ў цэнтральнай бібліятэцы раёна адбылася вечарына “Ты – женщина, ты – образ божества”.

7 сакавіка Ветрынская гарпасялковая бібліятэка

прапанавала сваім чытачам літаратурную кампазіцыю “Тепло маминых рук”, падрыхтаваную сумесна з Ветрынскай школай мастацтваў.

15 сакавіка супрацоўнікі Руднянскай бібліятэкі запрасілі старшакласнікаў на вечар пытанняў і адказаў “Канстытуция – символ эпохи”.

21 сакавіка Полацкая цэнтральная бібліятэка сумесна з членамі літаратурнага аб’яднання “Наддзвінне” правяла вечарыну “Над Дзвіною вершы гучаць”, на якую былі запрошаны выканаўцы бардаўскай песні.

Пазнавальную гульню для чытачоў малодшага і сярэдняга ўзросту ”Деревья – украшение земли” падрыхтавалі і правялі **25 сакавіка** бібліятэкары Новагаранскай бібліятэкі сумесна з мясцовым СДК. На мерапрыемства былі запрошаны прадстаўнікі Полацкага лясніцтва.

Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк

13 сакавіка ў памяшканні дзіцячай бібліятэкі імя У. Дубоўкі праведзены літаратурна-гістарычны нарыс “Францыск Скарына - першадрукар беларускай праваслаўнай кнігі” з вучнямі СШ № 2 г. Паставы. Мерапрыемства прымеркавана да Дня праваслаўнай кнігі.

Гутарка-гульня “Дружим с законом” прайшла ў дзіцячай бібліятэцы імя У. Дубоўкі сумесна з прадстаўніком інспекцыі па справах непаўналетніх. На сустрэчу прыйшлі вучні СШ № 2 г. Паставы. Сустрэча была пабудавана на дыялогу, выказваннях і меркаваннях па тэме.

14 сакавіка прайшло пасяджэнне клуба па інтарэсах “Сучаснікі” “И когда говорят «красота», мне всегда представляется женщина”, прысвечанае Дню жанчын. У чытальнай зале гучалі вершы, прысвечаныя жанчыне, песні, гумар.

Юнькаўская сельская бібліятэка правяла акцыю для